# **Пакладзём** удачу ў кепку!

**Днямі ў Маладзёжным тэатры эстрады адбылася аўтарская вечарына Уладзіміра САРОКІНА. Амаль 15 гадоў ён быў вядомы як удзельнік ансамбля "Сябры", цяпер выкладае майстэрства аранжыроўкі на кафедры эстрады Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, а ягоныя песні — у рэпертуары многіх салістаў і творчых калекты-**


**Анатоль Ярмоленка і Уладзімір Сарокін**

Апошняе можна было адчуць і на згаданым канцэрце. Спявалі Ірына Дарафеева, артысты яе Тэатра песні, уключаючы Інгу Кісялёву, Яўгена Слуцкага, Кацярыну Муратаву, якая прайшла кастынг і выконвае партыю Князёўны Тараканавай у мюзікле "Блакітная камея". А яшчэ — Якаў Навуменка, Вячаслаў Статкевіч з ансамбля "Свята", узорны дзіцячы ансамбль "Буслік" (а Сарокін піша для дзяцей шмат і добра), студэнты і вакальныя ансамблі БДУКІМ — "Беларуская песня" і "Універсум" пад кіраўніцтвам Таццяны Дробышавай з ансамбля "Камерата". І ўсё гэта — пад назвай "Удача", паводле адной з прэм'ерных песень.

— Калі ўбачыў гэты верш Васіля Жуковіча, — кажа Уладзімір Сарокін, — адразу "запаліўся": ён быццам падслухаў мае думкі! Таму і на вечары я выконваў гэтую песню сам, хаця раблю гэта вельмі і вельмі рэдка.

— **Ды ўсё ж, што такое для вас удача? Ці часта вы яе адчуваеце? Толькі не адказвайце тэкстам песні!**

— Ужо само жыццё — ці ж гэта не ўдача? Яна звычайна чакае чалавека ледзь не на кожным кроку, трэба толькі яе заўважаць і падтрымліваць. Увогуле, удачу ствараем мы самі. А яшчэ —тыя людзі, якія побач. У дзяцінстве— бацькі, а ў мяне яшчэ і бабуля, якая бачыла ўва мне ледзь не будучага Святаслава Рыхтара. Педагогі (я заканчваў нашу кансерваторыю як піяніст, потым вучыўся як кампазітар— у Яўгена Глебава); калегі (з Анатолем Ярмоленкам мы і цяпер у добрых стасунках); удзячныя слухачы, у тым ліку ў Расіі; любімая жонка — спявачка Кацярына Саковіч (бывае, сяджу за камп'ютарам — нічога не атрымліваецца, а ледзь яна ў пакой увойдзе, нават з кухні, дзе варыць боршч, — адразу натхненне з'яўляецца!); сын Цімафей (ён вучыцца ў 6-м класе каледжа пры Акадэміі музыкі, спявае ў знакамітай Капэле хлопчыкаўУладзіміра Глушакова, таксама спрабуе сачыняць)... А яшчэ ўдача — гэта, нэйперш, апантанасць самога чалавека, яго адданасць справе і само жаданне працаваць. Бо іначай удача "зваліцца на галаву", а чалавек задзярэ нос (ці ж утрымаецца што на галаве і ў ёй самой у такім стане?) — і пойдзе далей, нібыта нічога не было. А потым скардзіцца: маўляў, удача мяне мінула...

— **Дык вы таму і кепку носіце, каб удачу ўтрымаць? Яна ўжо частка іміджа...**

— Усё куды прасцей. У "Сябрах" адзін са строяў пашылі з кепкай, і мне так спадабалася!..

Кепка "таму віной" ці не, але Уладзімір, пры ўсім яго графска-шляхецкім паходжанні па лініі прабабкі, мае імідж "простага хлопца". І песні яготакія ж — шчырыя, меладычныя, ад іх не толькі душа спявае, але і, здаецца, уся прырода навокал! Можа, таму што прозвішча ў яго "птушынае"? Ці з-за першай песні ў пяць гадкоў — пра рыжае кацяня? Дый цяпер у сям'і жыве "дваранскі" сабака. Праўду кажуць: добры чалавек— добрыя песні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ